# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2006»

*Чацвер, 26 студзеня 2006 года*

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання; складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна адказалі на пытанне;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

---

**1.** Якая літара ў беларускай мове не абазначае гука?
**А)** і; **Б)** ў; **В)** ь; **Г)** й; **Д)** ц.

**2.** Вызначце словы, якія маюць адзін склад.
1) *сок*; 2) *кісель*; 3) *морс*; 4) *кава*; 5) *кефір*; 6) *малако*.
**А)** 1, 3; **Б)** 1, 5; **В)** 2, 4; **Г)** 3, 6; **Д)** 4, 6.

**3.** Колькі разоў сустракаецца гук **[а]** у словах прыказкі ***«якая справа, такая і слава»***?
**А)** 7; **Б)** 9; **В)** 10; **Г)** 11; **Д)** 13.

**4.** Выберыце правільны алфавітны парадак назваў беларускіх рэк.
1) *Буг*; 2) *Шчара*; 3) *Сож*; 4) *Нёман*; 5) *Дзвіна*; 6) *Прыпяць*.
**А)** 1, 5, 4, 6, 3, 2; **Б)** 1, 5, 6, 4, 2, 3; **В)** 5, 1, 6, 4, 3, 2;
**Г)** 4, 1, 5, 6, 3, 2; **Д)** 3, 1, 5, 4, 6, 2.

**5.** У якіх словах уставіце ***дж***?
1) *брыга...ір*; 2) *ура...ай*; 3) *ты...ень*; 4) *дож...ык*; 5) *а...енне*; 6) *са...анцы*.
**А)** ва ўсіх словах; **Б)** 1, 4, 5; **В)** 2, 4, 6; **Г)** 2, 3, 5; **Д)** 3, 4, 6.

**6.** Як вымаўляюцца гукі [т], [с], [ц’], [ч] перад звонкімі зычнымі?
**А)** мякка; **Б)** цвёрда; **В)** глуха; **Г)** звонка; **Д)** падоўжана.

**23.** Якая літара займае пятнаццатае месца ў беларускім алфавіце?
**А)** к; **Б)** л; **В)** м; **Г)** н; **Д)** о.

**24.** Якія назоўнікі з прыведзеных ужываюцца толькі ў множным ліку?
1) *аглоблі*; 2) *апілкі*; 3) *арэлі*; 4) *абрысы*.
**А)** 1, 2; **Б)** 1, 3; **В)** 2, 3; **Г)** 3, 4; **Д)** усе назоўнікі.

**25.** Вызначце, у якіх спалучэннях слоў дапушчаны памылкі?
1) *ён мерыць*; 2) *хлопец добр*; 3) *ты старанен*;
4) *хадзіў па гораду*; 5) *вырашыў пытання*; 6) *сіняя мора*.
**А)** 1, 2, 4; **Б)** 1, 3, 5; **В)** 2, 4, 6;
**Г)** 2, 5, 6; **Д)** ва ўсіх спалучэннях.

**26.** Якому фразеалагізму дала пачатак легенда пра караля Артура, паводле якой для таго, каб усе рыцары адчувалі сябе ў караля роўнымі, яны сядзелі не за прамавугольным сталом, а за сталом іншай формы?
**А)** круглы стол; **Б)** востравугольны стол; **В)** асінавы стол;
**Г)** авальны стол; **Д)** пяцікутны стол.

**27.** Які беларускі адпаведнік можна падабраць да слова іншамоўнага паходжання *дакляраваць*?
**А)** успамінаць; **Б)** вітаць; **В)** абяцаць; **Г)** ехаць; **Д)** углядацца.

**28.** У якім горадзе ўстаноўлены помнік беларускаму асветніку, дзеячу беларускай культуры Сымону Буднаму?
**А)** Мір; **Б)** Нясвіж; **В)** Заслаўе; **Г)** Мсціслаў; **Д)** Валожын.

**29.** Каго з усходнеславянскіх першадрукароў і гравёраў 16 стагоддзя вы ведаеце?
**А)** Пётр Мсціславец; **Б)** Лазар Богша; **В)** Усяслаў Чарадзей;
**Г)** Сімяон Полацкі; **Д)** Андрэас Везалій.

**30.** Хто з беларускіх пісьменнікаў 19 стагоддзя, адзін з пачынальнікаў жанру байкі, падпісваў свае творы псеўданімам граф Бандзінелі?
**А)** Алесь Гарун; **Б)** Антон Адынец; **В)** Ігнацій Быкоўскі;
**Г)** Альгерд Абуховіч; **Д)** Францішак Багушэвіч.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, РЗШ АПА («Буслік»).*
*тэл. (017) 232 80 31, 239 91 72; e-mail: kenguru_belarus@mail.ru*
*http://bak.academy.edu.by*

ГА «Беларуская асацыяцыя «Конкурс». Заказ 3. Тыраж 23500 экз.

**7.** Дапамажыце Сымонку правільна дапісаць сказ ***«Хлопчык вёў размову ...»***
**А)** па ціліфоне; **Б)** па тэлефону; **В)** па тэлефоне;
**Г)** па тэліфоне; **Д)** па тэліфону.

**8.** Вызначце лічэбнікі.
1) *дзвесце*; 2) *двойка*; 3) *двое*; 4) *сотня*; 5) *двойчы*; 6) *трэць*.
**А)** няма лічэбнікаў; **Б)** 1, 3; **В)** 2, 4; **Г)** 3, 5; **Д)** 4, 6.

**9.** Колькі ў беларускім алфавіце галосных літар, якія абазначаюць цвёрдасць зычных?
**А)** 4; **Б)** 5; **В)** 6; **Г)** 8; **Д)** 10.

**10.** У якіх словах пры перакладзе на рускую мову змяняецца лік?
1) *дзверы*; 2) *гуслі*; 3) *лекі*; 4) *паводзіны*; 5) *блізняты*; 6) *зерне*.
**А)** ва ўсіх словах; **Б)** 1, 2, 5; **В)** 1, 3, 4; **Г)** 2, 3, 6; **Д)** 3, 4, 5.

**11.** Дадзены словы:
1) *лес*; 2) *вымакне*; 3) *гарадок*; 4) *узгорак*; 5) *здалёк*; 6) *хутка*.
Якія з іх маюць нулявы канчатак?
**А)** 1, 2, 4; **Б)** 1, 3, 4; **В)** 2, 3, 6; **Г)** 2, 5, 6; **Д)** 3, 4, 5.

**12.** Якую часціну мовы некаторыя вучні вельмі часта блытаюць з назоўнікам, прыметнікам, прыназоўнікам?
**А)** выклічнік; **Б)** дзеяслоў; **В)** прыслоўе;
**Г)** злучнік; **Д)** займеннік.

**13.** Колькі памылак дапусціў вучань у сачыненні, пра якое беларускі паэт М. Чарняўскі напісаў у вершы «Сачыненне»?

*Я хадзіў на фіхтаванне.*
*Я хадзіў на віславанне.*
*Ды нідоўга віславаў –*
*Раптам трэнір зазлаваў.*
*Як убачыў дзённік мой,*
*На міне махнуў рукой.*
*Быў я ў секцыі дзідо,*
*Ды і там сказалі: «До!»*
*Дома я ціпер сяджу,*
*Бо нікуды не хаджу.*
*Ды ў мяне характір цвёрды –*
*Будуць поспіхі, рыкорды!*

**А)** няма памылак; **Б)** 8; **В)** 10; **Г)** 11; **Д)** 12.

**14.** Якія прыстаўкі пішуцца нязменна і перад звонкімі зычнымі, і перад глухімі?
1) *аб-*; 2) *ад-*; 3) *з-*; 4) *рас-*; 5) *пад-*; 6) *над-*; 7) *без-*.
**А)** усе прыстаўкі; **Б)** 1, 2, 5, 6; **В)** 1, 3, 6, 7;
**Г)** 2, 4, 5, 6; **Д)** 3, 5, 6, 7.

**15.** У якіх дзеясловах напішаце мяккі знак?
1) *едз...це*; 2) *кіс...не*; 3) *надз...муцца*;
4) *застан...ся*; 5) *нес...ці*; 6) *абыс...ці*.
**А)** 1, 3, 4; **Б)** 1, 4, 6; **В)** 2, 3, 5;
**Г)** 3, 4, 6; **Д)** ва ўсіх дзеясловах.

**16.** Вызначце слова, у якім вымаўляюцца тры санорныя гукі.
1) *вакзал*; 2) *зухавата*; 3) *маліны*; 4) *валейбол*; 5) *вандроўнік*.
**А)** 1; **Б)** 2; **В)** 3; **Г)** 4; **Д)** 5.

**17.** Да якога назоўніка найлепш дапасуюцца прыметнікі ***белы***, ***пшанічны***, ***чорны***, ***смачны***?
**А)** дом; **Б)** абутак; **В)** пейзаж; **Г)** хлеб; **Д)** выгляд.

**18.** Дадзены словы:
1) *ноч*; 2) *дзядзька*; 3) *насып*; 4) *ягня*;
5) *зямля*; 6) *брыгадзір*; 7) *Даніла*.
Вызначце рознаскланяльныя назоўнікі.
**А)** 1, 3, 5; **Б)** 2, 3, 6; **В)** 2, 4, 7; **Г)** 3, 4, 5; **Д)** 4, 5, 7.

**19.** Пастаўце неабходныя прыназоўнікі на патрэбнае месца ў паэтычных радках М. Пазнякова:

*...небе халодным*
*...гай, паплавы*
*...берагам родным*
*лятуць жураvы.*

**А)** на, над, за; **Б)** па, на, пад; **В)** у, за, над;
**Г)** аб, за, з; **Д)** у, пад, над.

**20.** Бабуля сказала ўнукам, што ў народзе зімовы дождж называюць ...
**А)** снегапад; **Б)** адліга; **В)** абліваха;
**Г)** распранаха; **Д)** сівер.

**21.** Якога слова не хапае ў фразеалагізме ***«як свае ... пальцаў»***?
**А)** шэсць; **Б)** восем; **В)** сваіх; **Г)** шмат; **Д)** пяць.

**22.** Вучні падбіралі прыклады назоўнікаў на тэму «Сталярныя інструменты». Алесь прапанаваў назоўнік *абрус*, Янка – *пасталы*, Міхась – *сурдут*, Васіль – *гэбель*, Сымон – *выжал*. Хто правільна падабраў прыклад?
**А)** Алесь; **Б)** Янка; **В)** Міхась; **Г)** Васіль; **Д)** Сымон.